ЗАЦВЕРДЖАНА
Пастанова
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь
17.03.2020 №28

# Вучэбная праграма факультатыўных заняткаў
# «Роднае слова»
# для I–IV класаў устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі

# ГЛАВА 1
# АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1. Вучэбная праграма факультатыўных заняткаў «Роднае слова» (далей – вучэбная праграма) прызначана для I–IV класаў устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі.

2. Мэта – фарміраванне маўленча-камунікатыўнай і лінгвакультуралагічнай кампетэнцый вучняў праз спасціжэнне духоўнай і матэрыяльна-бытавой традыцыйнай беларускай культуры на аснове мастацкіх тэкстаў.

3. Задачы:

вучыць спасцігаць характэрныя рысы беларускага маўлення, назіраць і пераймаць яго стылістычныя адметнасці і эмацыянальную выразнасць;

знаёміць вучняў з элементамі беларускай нацыянальнай духоўнай, абрадавай, бытавой культуры;

знаёміць вучняў з выдатнымі ўзорамі беларускай нацыянальнай маўленчай культуры з мэтай асэнсавання імі этнічнай ментальнасці;

фарміруе ў вучняў асобасна значымыя матывы вывучэння беларускай мовы праз усведамленне яе побытавай прыстасаванасці і нацыянальна-культурнай значнасці;

спрыяе засваенню вучнямі лексіка-семантычных адзінак у працэсе матываванага суразмоўніцтва і ўвядзенню іх у актыўны слоўнік вучняў.

4. Асноўнымі метадамі навучання з'яўляюцца моўныя гульні, дыялогі, камунікатыўныя практыкаванні, слуханне і чытанне фальклорных і літаратурных тэкстаў, элементарны моўны аналіз тэкстаў, гутарка, завучванне на памяць невялікіх вершаў, развучванне песень, драматызацыя і інш.

Пры выбары форм арганізацыі факультатыўных заняткаў неабходна пазбягаць дубліравання ўрокаў беларускай мовы, фармалізацыі маўленчага асяроддзя. Пажадана выкарыстоўваць формы, характэрныя для пазакласнай і пазашкольнай работы (ранішнікі, конкурсы, народныя святы, экскурсіі ў этнаграфічны (гістарычны) музей, наведванне тэатраў, мастацкіх выставак і г. д.), прыцягваць вучняў да падрыхтоўкі заняткаў, абуджаць у іх ініцыятыву ў выбары спосабаў арганізацыі і правядзення асобных частак заняткаў.

5. Змест вучэбнага матэрыялу складаецца з наступных блокаў:

«Маўленчы этыкет»: этыкетныя словы і выразы прывітання, развітання, прабачэння, спачування, суцяшэння, віншавання, звароту,

запрашэння, просьбы, падзякі, згоды, адмовы, ушчування, захаплення, здзіўлення і інш.

«Слова ў гульні»: скорагаворкі, пацешкі, лічылкі, забаўлянкі, нескладухі, загадкі, задачкі і інш.

«Слова ў песні»: калыханкі, традыцыйныя абрадавыя і жартоўныя песні, папулярныя народныя песні, песні-танцы і інш.

«Само слова гаворыць»: народныя параўнанні, «гаваркія» словы, крылатыя народныя выслоўі, прыказкі і прымаўкі, вобразнае слова і інш.

Вучэбная праграма адабрана і структуравана такім чынам, што асобныя яе кампаненты адносна аўтаномныя. Гэта дае магчымасць вывучаць як сістэмны курс, так і яго асобныя часткі. На адных занятках можна аб'ядноўваць матэрыял розных блокаў (напрыклад: загадкі, гаваркія словы, маўленчая этыка). У адпаведнасці з вучэбным планам факультатыўныя заняткі праводзяцца за кошт гадзін школьнага кампанента (1 гадзіна на тыдзень). Працягласць заняткаў адэкватна працягласці ўрока ў пэўным класе. Матэрыял для правядзення факультатыўных заняткаў настаўнік адбірае ў адпаведнасці з праграмай.

6. У выніку засваення зместу вучэбнай праграмы факультатыўных заняткаў «Роднае слова»:

6.1. вучні I класа павінны:

ведаць:

пра выкарыстанне этыкетных слоў і выразаў для выказвання прывітання, развітання, прабачэння, падзякі, нормы маўленчых паводзін пры іх ужыванні;

пра традыцыйныя народныя параўнанні;

пра прызначэнне пацешак, загадак, калыханак;

умець:

вітацца, развітвацца, дзякаваць, прасіць прабачэння;

слухаць, разумець і правільна вымаўляць пацешкі, забаўлянкі, прыказкі, гаваркія словы, народныя параўнанні;

спяваць калыханкі, адгадваць загадкі;

6.2. вучні II класа павінны:

ведаць:

пра выкарыстанне этыкетных слоў і выразаў для выказвання згоды, адмовы, просьбы, нормы маўленчых паводзін пры іх ужыванні;

пра прызначэнне фальклорных твораў малых жанраў;

пра ролю прыказак у маўленні;

умець:

выказваць згоду, просьбу, адмову, звяртацца да суразмоўцы;

выкарыстоўваць у гульні лічылкі, дражнілкі, заклічкі;

вызначаць у мове прыказкі, гаваркія словы;

6.3. вучні III класа павінны:

ведаць:

пра выкарыстанне этыкетных слоў і выразаў для выказвання запрашэння, віншавання, нормы маўленчых паводзін пры іх ужыванні;

пра папулярныя народныя песні;

пра ролю прыказак і прымавак у маўленні;

умець:

выказваць пажаданні, запрашэнне, ушчуванне, захапленне, віншаванне;

вымаўляць скорагаворкі;

выкарыстоўваць у гульні лічылкі;

вызначаць народныя параўнанні, прыказкі і прымаўкі ў маўленні;

6.4. вучні IV класа павінны:

ведаць:

пра словы, якія перадаюць эмацыянальны стан чалавека;

пра гульні як элементы традыцыйнай абрадавай культуры беларусаў;

пра крылатыя выразы, вобразныя словы як сродкі выразнасці беларускага маўлення;

умець:

выказваць здзіўленне, радасць, суцяшэнне, жаль;

гуляць у абрадавыя гульні з выкарыстаннем абрадавых песень;

вызначаць у маўленні крылатыя выразы, вобразныя і гаваркія словы.

## ГЛАВА 2
## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

### I клас (34 гадзіны, з іх 1 гадзіна – рэзервовая)
### Маўленчы этыкет (14 гадзін)

Сустрэча («добры дзень», «дзень добры», «добрай раніцы», «добрая раніца», «добры ранак», «добрага ранку», «добрага здароўя», «прывітанне», «як маешся», «што новага», «як жыццё», «рад бачыць», «як справы», «рад вітаць», «дазвольце зайсці», «ці можна зайсці», «заходзьце, калі ласка», «прабачце, што патурбаваў», «можа б зайшлі на хвілінку»).

Развітанне («да пабачэння», «бывайце здаровы», «усяго добрага», «пакуль», «да сустрэчы», «дабранач», «добрай ночы», «дазвольце развітацца», «шчаслівай дарогі», «не забывайцеся», «чакаем званка», «сумна, што трэба развітвацца»).

Прабачэнне («прабачце», «прабачце калі ласка», «прабачце за турботы», «прашу прабачэння», «выбачайце», «выбачайце, калі ласка», «даруйце», «не злуйце, калі ласка»).

Падзяка («дзякуй», «дзякуй за гасціннасць», «вялікі дзякуй», «дзякуй за пачастунак», «дзякуй за запрашэнне», «чым жа вас аддзячыць», «хачу вас аддзячыць»).

Слова ў гульні (6 гадзін)

Пацешкі і забаўлянкі («Сарока-варона», «Ладу, ладу, ладкі», «Кую-кую ножку»).

Загадкі (народныя вершаваныя загадкі пра навакольнае асяроддзе).

Слова ў песні (6 гадзін)

Калыханкі («Спі, дачушка, спі», «А ты, коцік, не хадзі», «Баю-баю-баю», «Люлі-люлі-люлі»).

Калыханкі (В. Вітка «Калыханка», «Іванка», Г. Бураўкін «Калыханка», Р. Барадулін «Калыханка»).

Само слова гаворыць (7 гадзін)

Прыказкі («у сваім краі, як у раі», «няма смачнейшае вадзіцы, як з роднае крыніцы», «чалавек без працы, што птушка без крылаў», «шануй бацьку з маці: другіх не знойдзеш»).

Гаваркія словы (настольнік, падвячорак, вячэра, абед, полудзень, ложак, падлога, гасцёўня, спальня).

Народныя параўнанні («як мыла з'еўшы», «магутны, як дуб», «хітры як ліс», «чорны як сажа», «чырвоны як рак»).

Засваенне традыцыйнай этыкетнай лексікі ў працэсе слухання мастацкіх тэкстаў, гутаркі па зместу пачутага, разыгрывання сітуацый паводле зместу пачутага, складання дыялогаў. Слуханне і спяванне калыханак, вызначэнне слоў, якія перадаюць настрой, эмоцыі, пачуцці, сродкі напеўнасці і меладычнасці ў народных і аўтарскіх калыханках. Развучванне пацешак і забаўлянак з адпаведнымі рухамі. Адгадванне загадак, тлумачэнне слоў-падказак, слоў – сродкаў стварэння вобразаў. Тлумачэнне значэння гаваркіх слоў. Дарэчнае выкарыстанне народных параўнанняў ва ўласным маўленні.

Рэзерв (1 гадзіна).

II клас (34 гадзіны, з іх 1 гадзіна – рэзервовая)

Маўленчы этыкет (12 гадзін)

Зварот («дарагі», «любы», «паважаны», «шаноўны», «прашу ўвагі», «увага», «скажыце, калі ласка», «зрабіце ласку», «будзьце ласкавыя», «пачакайце, калі ласка», «дазвольце, калі ласка», «хадземце», «малады чалавек», «звярніце, калі ласка ўвагу»).

Згода («так», «добра», «зараз», «ваша праўда», «я не супраць», «я не пярэчу», «так, вядома», «вядома», «з задавальненнем», «безумоўна»,

«несумненна», «не сумняваюся», «зразумела», «не перашкаджаю», «выдатна»).

Адмова («не», «не хачу», «дзякуй, не», «нельга», «не магу», «няма часу», «немагчыма», «на жаль», «не жадаю», «не раю», «вельмі шкада, але»).

Просьба («прашу вас», «ратуйце», «дапамажыце, калі ласка», «хацеў бы папрасіць», «пакажыце, калі ласка», «падайце, калі ласка»).

Слова ў гульні (7 гадзін)

Лічылкі (народныя: «Кацілася торба», «Раз, два, тры, чатыры», аўтарская: В. Вольскі «Попел, попел…»).

Дражнілкі («Бусел», «Стрыжка-камарыжка»).

Заклічкі («Ідзі, ідзі, дожджыку», «Божая кароўка»).

Загадкі (народныя загадкі-пытанні, вершаваныя народныя і аўтарскія загадкі).

Слова ў песні (6 гадзін)

Жартоўныя песні («Як рабіла я ў пана», «Яська ды Грышка» і інш.)

Само слова гаворыць (8 гадзін)

Прыказкі («узяўся за гуж – не кажы, што не дуж», «умеў памыліцца, умей і паправіцца», «чалавек без друга, што яда без солі»).

Гаваркія словы (ліпень, жнівень, верасень, лістапад, снежань, студзень, люты, сакавік, красавік, вяснушкі і інш.).

Народныя параўнанні («белы як малако», «востры як брытва», «упарты як асёл», «дужы як вол»).

Чытанне твораў малых жанраў, завучванне па слыху на памяць, завучванне на памяць са зрокавай апорай на друкаваны тэкст, складанне лічылак, нескладух, загадак. Гутарка аб прызначэнні твораў малых жанраў. Роля прыказак у маўленні, дарэчнасць іх ужывання. Тлумачэнне і ўжыванне гаваркіх слоў, словатворчасць.

Рэзерв (1 гадзіна)

III клас (35 гадзін, з іх 1 гадзіна – рэзервовая)

Маўленчы этыкет (12 гадзін)

Віншаванне («віншую», «сардэчна віншую», «віншую ад шчырага сэрца», «дазвольце павіншаваць», «са святам», «з днём нараджэння», «прыміце ад усяго сэрца»).

Пажаданне («жадаю», «добрага здароўя», «шчасця вам», «будзьце здаровыя», «будзьце шчаслівыя», «памажы вам Божа», «хай усё будзе добра»).

Запрашэнне («прашу», «просім у хату», «дазвольце запрасіць», «не саромейцеся», «заходзьце, калі ласка», «распранайцеся, калі ласка», «праходзьце, калі ласка», «сядайце, калі ласка», «частуйцеся, калі ласка», «ешце, калі ласка», «смачна есці», «запрашаем у госці»).

Ушчуванне («як жа ж так», «так нельга», «больш так не рабі», «як жа ты мог», «што ж ты нарабіў»).

Захапленне («цудоўна», «гэта цудоўна», «якая пекната», «якая прыгажосць», «дзіва», «проста дзіва», «якое дзіва», «што за дзіва», «я ўзрушаны гэтым», «я ў захапленні»).

Слова ў гульні (6 гадзін)

Скорагаворкі, нескладухі («Тры вароны наваротах», «На двары без пары таўкуць мак камары», «У двары горка, пад горкай – норка»).

Задачкі (В. Вольскі «Мая сям'я» і інш.).

Слова ў песні (7 гадзін)

Песні-танцы («Лявоніха», «Месяц», «Лянок» і інш.).

Папулярныя народныя песні («Купалінка», «Рэчанька», «За туманам»).

Само слова гаворыць (9 гадзін)

Народныя параўнанні («цёплы як сонца», «гарачы як агонь», «мяккі як пух», «салодкі як мёд» «слабы як націна», «круглы як гарбуз», «горкі як асіна»).

Словы-назвы (вёскі Гарадзішча, Парэчча, Дуброва, Падбярэжжа).

Гаваркія словы (падбярозавік, падасінавік, баравік, апенькі, мухамор, лісічкі, рыжыкі, маслякі).

Прыказкі і прымаўкі («пры сонейку цёпла, пры матцы добра», «навука даражэй за ўсякае багацце», «рэшатам вады не наносіш», «чым багаты, тым і рады», «у нагах праўды няма», «не ў службу, а ў дружбу», «сядзем радком, пагаворым ладком»).

Чытанне і развучванне беларускіх песень, гутарка пра народныя традыцыі. Гульні са скорагаворкамі, гульні-лічылкі. Састаўленне нескладух і задачак. Перадача пры выкананні песень іх эмацыянальнай насычанасці, вылучэнне ў тэксце лексічных сродкаў выразнасці. Перадача настрою пры выкананні песень-танцаў, развучванне рухаў. Назіранне за ўжываннем і выкарыстаннем прыказак і прымавак у маўленні. Вызначэнне і ўжыванне гаваркіх слоў і народных параўнанняў у маўленні. Этымалагічнае паходжанне слоў-назваў.

Рэзерв (1 гадзіна).

IV клас (35 гадзін, з іх 1 гадзіна – рэзервовая)

Маўленчы этыкет (11 гадзін)

Жаль («шкада», «якое гора», «якое няшчасце», «якая непрыемнасць», «як непрыемна»).

Здзіўленне («няўжо», «не чакаў», «вось яно што», «ты пабач», «а-я-яй»).

Радасць («якая радасць», «вельмі рад», «якое шчасце»).

Суцяшэнне («усё будзе добра», «не турбуйся, калі ласка», «не хвалюйся, калі ласка», «прашу цябе, не плач», «не плач, калі ласка», «супакойся, калі ласка», «шчыра спачуваю», «прымі мае спачуванні», «не бядуй», «усё абыдзецца», «смеху варта»).

Слова ў гульні (6 гадзін)

Абрадавыя гульні («Карагод», «Мядзведзь», «Каза»).

Слова ў песні (7 гадзін)

Абрадавыя песні (калядныя, валачобныя, купальскія і інш.).

Сучасныя песні з выразным нацыянальным каларытам («Крынічанька», «Лянок», «Касіў Ясь канюшыну»).

Само слова гаворыць (10 гадзін)

Гаваркія словы (вяселле, чарніцы, зверабой, пралескі, незабудкі, касачы, верас, дзік, землярыйка).

Словы-назвы (вёскі Камароўка, Залессе, Забалоцце і інш.).

Паходжанне слова (устарэлыя словы: андарак, карчма, куфар, рыдван, фурман; неалагізмы: гаджэт, дрон, маркет; запазычанні: акварыум, тэлефон, тэлевізар).

Вобразнае слова (дуб-волат – вялікае дрэва, залаты дыван – апалае лісце, белая коўдра – снег).

Крылатыя народныя выслоўі («абое рабое», «сказаў, як звязаў», «лыкам шытыя», «не сёння – заўтра», «як дзве кроплі вады»).

Чытанне тэкстаў, вызначэнне семантыкі слоў, назіранні над словам у кантэксце, этымалогіяй слова, вобразнымі рэсурсамі мовы. Вызначэнне ролі і сэнсу крылатых народных выслоўяў, ужыванне іх у маўленні. Знаёмства з абрадавай культурай. Драматызацыя абрадавых гульняў і песень.

Рэзерв (1 гадзіна).